**ЗЬНІЧ**

# РЭХА МАЛІТВЫ

**Вершы зь Беларусі**

**Нью-Ёрк, 1988**
**Выдавецтва «Беларус»**
**Коштам Фундацыі імя П. Крэчэўскага**

KAMUNIKAT.org

На вокладцы — выява Хрыста з драўлянай скульптуры беларускага народнага мастака канца XIV ст.

# ПАЭЗІЯ ЗЬНІЧА

Частка зьмешчаных у гэтым зборніку вершаў (15 з 26-х) была апублікаваная ў газэце «Беларус» (№ 303-304, жнівень-верасень 1982 г.). Рэшта друкуецца ўпяршыню.

Вершы былі напісаныя ў Менску ў 1981 годзе. Аўтар іхны, чалавек сярэдняга веку, жыве й цяпер у БССР. Творы ягоныя, восем рукапісных лісткоў, дайшлі да рэдакцыі «Беларуса» навакольнымі шляхамі й друкуюцца бязь ведама й згоды аўтара.

Загаловак гэтай кніжыцы (захоўваючы ў ёй парадак вершаў згодна з рукапісам) далі мы самі, назваўшы зборнік загалоўкам першага вершу — «Рэха малітвы». У гэтым аднастрофным вершы добра ўняты аўтараў пагляд на паэзію, як на працэс творчасьці вольнае, паза «зямнымі багацьцямі», паза «ўзнагародай» ці «карай». Прычым паэзія для Зьніча — ня толькі музыка слова («рыфмы»), але й інтэлект («паняцьці»), спалучэньне прыгожага з разумным. Сваёй творчасьцяй паэт працягвае й заглыбляе ў беларускай літаратуры традыцыю інтэлектуальнае паэзіі, да якое з сучас-

ных паэтаў БССР належыць арыгінальны сваймі творамі Алесь Разанаў.

Характар Зьнічовых вершаў філязофскі, патрыятычны ды падкрэсьлена хрысьціянскі. Выхад гэтага зборніка сваечасны асабліва сёлета, калі на Беларусі адбываецца інтэнсыўнае асэнсаваньне ролі народнае інтэлігенцыі ў ратаваньні свае нацыі ад «духовага выміраньня» (лісты 28-х і 134-х да Гарбачова, гл. «Беларус» №№ 335, 336, 338) ды калі адзначаецца 1000-годзьдзе хрысьціянства на Беларусі.

Сваймі хрысьціянскімі матывамі вершы Зьніча закранаюць аспэкт жыцьця акутальны наагул, а для савецкага грамадзтва асабліва войстры — праблему чэрствасьці душы чалавека, душы, якую атэістычныя «інжынеры душаў» ня здолелі перарабіць на лепшую, а баржджэй — наадварот. Бяздушнасьць, жорсткасьць, неспагадлівасьць становяць сёньня адну з галоўных тэмаў у савецкай літаратуры й публіцыстыцы, у тым ліку й беларускай. Прыкладам, пытаньне ўплыву хрысьціянскае маралі на ўчынкі чалавека цікава закранутае ў новым рамане выдатнага беларускага празаіка Васіля Быкава «Кар'ер» (праз пэрсанаж



жонкі праваслаўнага сьвятара Бараноўскага).

Пры сучаснай «перабудове», якая адбываецца ў Савецкім Саюзе, Зьніч ставіць пытаньне «перабудовы» душы чалавека, маралі й этыкі. І выказвае шкадаваньне, што з працэсу міжлюдзкіх дачыненьняў выэлімінаваная навука Хрыста: «...і род людзкі, лянівы, апантаны, ня мае сілы зьняць Яго з крыжа».

Зьнічовы вершы, асабліва некаторыя аднастрофныя, — гэта згусткі думак і вобразнасьці, якія, каб быць успрынятымі поўнасьцяй, вымагаюць ад чытача веды, роздуму, інтэлектуальнае працы. Ілюстрацыяй да сказанага можа быць чатырохрадкоўе «Кант».

*... Штадня гардыню розуму разворвае*
*ў ральлю су-моўя лятуценьнік кволы...*
*.. .цнатліва углядаюцца анёлы*
*у бездань сэрца і бяздоньне зорнае.*

Імануэль Кант (1724-1804), нямецкі філёзаф, найбольш ведамы працай «Крытыка чыстага розуму» (1781 г.). Кант сваім аналізам людзкога розуму выдатна спрычыніўся да здольнасьці чалавека пазнаваць самога сябе й наваколь-

ную рэчаіснасьць. Кантаўскі-ж «катэгарычны імпэратыў» («Рабі так, каб правіла, якім кіруешся магло стацца праз тваю волю ўнівэрсальным законам прыроды») забавязаў чалавека, паводля Зьніча, «цнатліва ўглядацца» ў свой нутраны сьвет і вонкавае навакольле. «Цнатліва» трэба аналізаваць, кажа наш паэт, і «астральныя» (шыракаплянавыя) «плыні су-моўя» (нашай моўнай злучанасьці); трэба «разворваць» гэтае «су-моўе» дасьледніцкай думкай, бо аналіз моўнага стану вядзе да глыбейшага самапазнаньня, паколькі мова — ключ да існасьці нацыянальнае культуры, нацыянальнае душы.

У зносцы да свайго чатырохрадкоўя «Кант» аўтар паясьняе: «Астральныя плыні су-моўя адпаведныя Кантавай трансцэндэнтальнай апэрцэпцыі». Паводля Канта, трансцэндэнтальная апэрцэпцыя — гэта ўсьведамленьне сябе самога (падобна як у Дэкарта: «Думаю, значыцца, існую»). У Зьніча «разворваная» ральля «су-моўя» — гэта ўсьведамленьне (праз аналіз моўнага стану) свайго народу як суб'екту гісторыі, усьведамленьне свае гістарычнае індывідуальнасьці, гістарычнае цягласьці. «Дзе у сьвеце плыве Беларусь?» — пытаецца аўтар і адказвае: «там, дзе вякі ўзнаўляюць нанова еднасьць сьвету з душой чалавека».



Не адразу могуць стацца зразумелымі й словы ў вершы «Філосафу»:

*Зьведаў-бы сьвет:*
*самагубства*
*нішчыць ваўкоў татальна...*

Сэнс: людзі мусяць зразумець, што вынішчаць ваўкоў поўнасьцяй (руйнаваць прыроду) — гэта самагубства для сьвету; гэтак-жа самагубна вынішчаць філёзафаў (змушаць іх «цярпець лютае глупства людзкое катавальні»), бо філёзафы, як тыя ваўкі ў прыродзе, выконваюць функцыю «санітараў», ачышчальнікаў думкі, чалавечае душы.

Аднастрофны верш «Рэха Асьветніцтва» — таксама згустак вобразнасьці й філязафічнасьці. Францускі філёзаф Вальтэр (1694-1778) заклікаў «раздушыць пачвару» нецалерантнасьці, дагматызму. Пачвара гэтая, як ведама, ажыла была ў Савецкім Саюзе ў форме камуністычнае догмы, у ахвяру якой прыносіліся ня толькі праўда й справядлівасьць, але й мільёны людзкіх жыцьцяў.

kamunikat.org

Вершы Зьніча асабліва зырка адлюстроўваюць беларускі патрыятызм аўтара, ягоную трывогу за свой найдаражэйшы скарб, родную мову. Паэт заклікае мову «вытрываць праз — зьнічаваньне» (гл. чатырохрадкоўе «Бацькаўшчына»). Што гэта «зьнічаваньне»? Паэт тлумачыць у зносцы: «тое, што робіць шкоду жыцьцю». Выраз «праз — зьнічаваньне» аўтар яшчэ тлумачыць як «адмаўленьне адмаўленьня». «Адмаўленьне адмаўленьня» належыць філязофіі дыялектычнага матар'ялізму, паводля якое працэс разьвіцьця праходзіць праз тры фазы: (1) адкіданьне (адмаўленьне) старога, (2) прыйманьне новага ды (3) прыйманьне ўсё-ж лепшых элемэнтаў старога (калі й адбываецца адмаўленьне ранейшага адмаўленьня). Сваім чатырохрадкоўем «Бацькаўшчына» Зьніч, як выглядае, хоча сказаць, што закон дыялектыкі (у які паэт верыць) «спрацуе» і ў дачыненьні да беларускае мовы, што па цяперашнім адрачэньні ад мовы прыйдзе адрачэньне ад першага адрачэньня, і мова выжыве на новай вышэйшай сьпіралі гістарычнага разьвіцьця (сьпіраль гэтая таксама становіць элемэнт дыялектыкі).



Паэт наш, узяўшы сабе за псэўданім «Зьніч» і паясьняючы «зьніч» як «дух сьмерці», хоча, відаць, сказаць гэтым, што ён — пасланец Духа Сьмерці, які перасьцерагае свой народ словамі Франьцішка Багушэвіча: «Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі!»

Кантэкст і падтэкст Зьнічовых вершаў нязвычайна багаты. Вершы яшчэ раз засьветчылі пра вялізарны патрыятычна-творчы патэнцыял сучаснае беларускае літаратуры. Яны паказваюць, што, кажучы словамі Максіма Багдановіча, «жыве яшчэ душа ў народзе гэтым», што жыве таксама надзея на часы, калі мовазнаўцы будуць ня толькі вывучаць мову, але й практыкаваць яе, ня будуць «мовы блуднымі сынамі»; што на грамадзкім форуме, вусным і друкаваным, заміж выступленьняў «віртуозаў сьлінявай палемікі» пачнуць абмяркоўвацца нарэшце запраўдныя праблемы нацыянальнае навукі й культуры.

Праз свае нешматслоўныя кампактныя вершы Зьніч выявіў чулую душу, гарачыя пачуцьці любасьці да роднага краю, глыбокую пашану праўды ды няштодзённую эрудыцыю. За ўсё гэта аўтар

бясспрэчна заслугоўвае на шчырую й трывалую ўдзячнасьць ад чытачоў ды ад ўсіх сваіх суродзічаў, што заклапочаныя тымі самымі праблемамі нацыянальнага існаваньня.

**Янка Запруднік**



## Рэха малітвы

Па-за зямнымі багацьцямі,
за ўзнагародай і карай,
шэпчуцца рыфмы з паняцьцямі
там, дзе адвольныя мары…

KAMUNIKAT.org

*    *    *

Вякі плывуць,
а Ён —
раскрыжаваны,
жывы...
ў крыві цячэ
цьвікоў іржа...
і род людзкі
лянівы
апантаны
ня мае сілы
зьняць Яго

з крыжа...



*    *    *

Боскасьць
— вечны цяжар і пакута...
ўсё да рэшты — самота...
нябыт...
ў зорным россыпе бэзавы смутак...
стогн сумленьня
і думкі блакіт...

KAMUNIKAT.org

*   *   *

З россыпу слоў-крышталю
прэлюдыяй і высновай,
промнем Хрыстовай хвалі
блісьне
Боскае
слова...



*   *   *

За што ты церпіш неадольны
зьдзек
адчужанай абрыдлай працы?
Куды плывеш ты, Божы чалавек,
прыкуты да галер цывілізацыі?

Мне рэхам
першародны грэх...

KAMUNIKAT.org

## Кант

…Штадня гардыню розуму
разворвае
ў ральлю су-моўя* лятуценьнік
кволы…
…цнатліва углядаюцца анёлы
у бездань сэрца і бяздоньне зорнае.

* Астральныя плыні су-моўя адпаведныя Кантавай трансцэндэнтальнай апэрцэпцыі.



## Філосафу

Ты да ваўка падобны —
урэшце, калі разабрацца,
воўк — санітар прыроды,
ты — санітар грамадзтва.
Церпіш лютае глупства
людзкое катавальні…
зьведаў-бы сьвет:
самагубства
нішчыць ваўкоў
татальна…

KAMUNIKAT.org

## Рэха Асьветніцтва

Пановаму кесары мусяць паліць
адвольную думку і мару...
І роспачнай, чорнай малітвай гарыць
Вальтэр: «Раздушэце пачвару!»



## Бацькаўшчына

Вытрывай,
мова,
праз —
зьнічаваньне...
Духа выснова —
раскрыжаваньне.

Праз — зьнічаваньне — «адмаўленьне адмаўленьня».

Зьніч — дух сьмерці.

Зьнічаваньне — тое, што робіць шкоду жыцьцю.

KAMUNIKAT.org

## Купалу

...Ты чуў...
сшэрае лес асінаю сівою...
змоўкне вырай
крумкачом самотным...
самлеюць мёды
дзьмухаўцом ачахлым...
счарнеюць душы
ў торбах моў чужых...
Чаму-ж тваe унукі, Янку,
паклалі вуха
— пад кіпцюр мядзьвежы? ..



* * *

*Плынь плыве, цячэ,*
*гоніць срэбра хваль*
*і ні ў кога дарог ня пытае.*
**Колас**

Дзе у сьвеце плыве Беларусь?
Там, дзе ў сьпевах лагоднае слова,
узыходзіць крывіцкае рэха...
дзе вякі узнаўляюць нанова
еднасьць сьвету з душой чалавека...
дзе ня бачна ужо небакраю
адухоўленасьці нястомнай...
і ў нікога дарог ня пытае
люд пакорлівы і нязломны...
Там павольна плыве Беларусь,
дзе зьліваюцца сум і сумленьне,
дзе адвечнае супраціўленьне,
дзе блакітны мужык
Кастусь...

KAMUNIKAT.org

*   *   *

*Не пакідайце-ж мовы нашай*
*беларускай, каб ня ўмёрлі!*
**Багушэвіч**

Умёрлі... заглыбілі
сум і маўчаньне...
Спраўдзілі ўсё, чым пакутаваў ты...
Горка і зьдзіўлена ўздых
разьвітальны
слухаюць крэўныя нашы браты...

Мовы падчаркі і каралеўны,
Чаму так дзееца, што вы няроўныя?
...Доляй забранай
бел-чырвона-белаю
моўчкі Мадонна
сына
ахоўвае...



*   *   *

Прагрэс — разьюшаная трызна
сумленьня, розуму, крыві...
А ты жыві,
Беларушчызна,
ў самоце...
падчаркай...
Жыві!

kamunikat.org

## М. Багдановічу

Праз маркоту сухотнай нядолі
Ты, як промень, жывіў здалёк
На стаптаным стагодзьдзямі полі
Кветку лёсу свайго — васілёк.

Золак Твой не растаў у сутоньні.
Праз ганебны здрадлівы змрок
Сьвеціць дадзены Богам прарок
Васільковай, нябёснай Пагоні.



## Нэагэрастраты

На лоўлі шчасьця і чыноў
у галіне архітэктуры
каля зьнявечаных муроў —
тлум патрыётаў ўласнай шкуры...
О, Менск — пакутнік, ўсё — абрыў...
Ты — ля мяжы апошняй страты.
Што злыдзень Марс* не дарабіў,
даробяць нэагэрастраты.

* Марс — бог вайны.

Гэрастрат — старавечны Грэк, які ў 356 г. да нашай эры спаліў выдатную сьвятыню, каб гэтым актам увекавечыць сваё імя. Імя Гэрастрата сталася сымбалем ганебна набытай славы.

KAMUNIKAT.org

...агонь...
...агонія
...мігціць Пагоня...



## Маўчаньне

Пра што маўчыш,
Белая Вежа,
счарнелай чырваньню кары цаглянай?
папмуркам каранёў
Беларушчызны?
і гольлем лесу,
здымленым блакітам?
і лісьцямі
зялёных сьвечак,
што на крыжах
зьвісаюць
спад нябёсаў?
...пра што маўчыш?..

KAMUNIKAT.org

## Землякам

Маўчаць труніцы, муміі і косьці.
Ты, мова, не маўчыш:
з прадоньня дзён, на сьветавым
пагосьце
зьвініць пісьмёнаў крыж.
Няма ў нас даражэйшага чагосьці.
Умейце-ж, Крывічы,
у меру сіл, у час пакут і злосьці
хоць мову зьберагчы!..



## Ля рэчышча Віслачы

Поўнай рака праплыла і зьнямелую
пойму пакінула.
Струны сасновыя ў смутку
самотным зрываюцца.
Рэхам ручай празьвініць
пра далёкую праўду-пакутніцу.
Ў золаце хваль акрываўлены
золак трапечацца...

Ты, Беларусь, ня сумуй, што
пустэчы пясчаныя
Бэзавым попелам цела тваё
зацярушылі...
Бель твая з чырваньню ў рэчышчах
сэрцаў асьвеціцца,
Голасам Боскім сыноў тваіх
верных напоўніцца.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

О, Крыўя — не!.. Цябе ня зморацъ.
Ты зноў асьвецішся знутры —
Як пакрывіцку загаворацъ
З Табой Хрыстовы сьвятары.

Самотным прывідам сьвятару
ля канфармісцкіх пустыроў,
запальваю сьвятую мару —
стварыць крывіцкіх сьвятароў!



## Хто гэта крочыць?

Хто гэта крочыць сьцяжынкай
няходжанай
у мройную квецень культур і духоўнасьці?
Хто нам пакорлівасьць сэрцу захоўвае
ў людзкай гардыні нашай зьняможанай?
Беларусь.. .

Так, аддала яна вопратку кесара,
быццам кашулю у прытчы славутае...
Хай сабе нехта па гэтым пакутуе,
гэта — ня вартае, гэта — ня крэсіва...

Так, не зрабілася зь «велькімі»
роўнаю...
крочыць амаль адчувальнымі зорамі...
Так, але падчарка сьвецкай гісторыі
прыйдзе яе каралеўнай духоўнаю.

KAMUNIKAT.org

## Навукоўцам-гуманітарыям

…У завеях слоўных… у мане,
у сцыенцысцкае гардыні
галінка мудрасьці загіне,
бы ў цэлафанавай труне…
…У танным мітусьлівым сьне
цярушым нярухомасьць плыні…



# ЦЕНІ СУЧАСЬНІКАЎ

## Пытаньні

…К р о ў канцлагерная…
што за людзі
выпівалі яе зь дзяцей? ..
Як яны выглядаюць
у будні,
у звычайнай хадзе падзей?
…Каталі…
для іх «рабсіла»
набіраецца-ж недзе тут,
побач з намі?..
І маці-ж расьціла
віртуозаў людзкіх пакут…
А ці-ж самі мы не катуем —
крыху меней, крыху лягчэй —
тых, хто побач? .. І ці ня смуткуем
ад зьмярцьвеласьці іх вачэй? ..

KAMUNIKAT.org

## Парада

(Сабе і некаторым сучасьнікам)

Каб корань мудрасьці у нас ня ссох,
каб пафас не нагадваў брэх сабачы,
давайце — праз сучкі чужых эпох —
свае бярвеньні не баяцца бачыць.



## Калегам-мовазнаўцам

Мовазнаўцы, мовазнаўцы!..
Мовы блудныя сыны!..
Здэцца, даў-бы ім па с…цы
Так, каб роднай мовы-маці
ня цураліся яны.

KAMUNIKAT.org

## Кандыдатам і акадэмікам

Ці ня сьніўся вам просты, як ісьціна,
сон, хоць зрэдку, ну, хоць аднойчы:
вам дазволілі зь целаў выпаўзьці
і самым сабе глянуць у вочы, —
віртуозы сьлінявай палемікі,
ад якой прасьмярдзелі скрыжалі,
кандыдаты і акадэмікі,
што вучонымі так і ня сталі.

Менск, 1981 г.

## ЗЬМЕСТ

Янка Запруднік. Паэзія Зьніча .......... 1
Рэха малітвы .......... 9
*** (Вякі плывуць) .......... 10
*** (Боскасьць) .......... 11
*** (З россыпу слоў) .......... 12
*** (За што ты церпіш) .......... 13
Кант .......... 14
Філосафу .......... 15
Рэха Асьветніцтва .......... 16
Бацькаўшчына .......... 17
Купалу .......... 18
*** (Дзе у сьвеце плыве Беларусь?) ... 19
*** (Умёрлі) .......... 20
*** (Прагрэс — разьюшаная трызна). 21
М. Багдановічу .......... 22
Нэагэрастраты .......... 23
*** (агонь... агонія) .......... 24
Маўчаньне .......... 25

KAMUNIKAT.org

Землякам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
Ля рэчышча Віслачы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
*** (О, Крыўя) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
Хто гэта крочыць? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Навукоўцам-гуманітарыям . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Пытаньні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Парада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
Калегам-мавазнаўцам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Кандыдатам і акадэмікам . . . . . . . . . . . . . . . . . 34